*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!*
*ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ*



# НАША СЛОВА




Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 14 (451) 5 КРАСАВІКА 2000 г.

## ЗАЯВА
### КІРАЎНІЦТВА ГРАМАДСКАГА АБ'ЯДНАННЯ "ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ"

***Грамадскі дыялог павінен спрыяць перамовам улады і апазіцыі***

Пасля падзей 25 сакавіка, калі на вуліцах беларускай сталіцы невядомыя людзі ў масках і без іх хапалі і збівалі нашых і замежных грамадзян, сярод якіх былі журналісты і дыпламаты, пачатак дыялогу грамадска-палітычных сілаў знаходзіцца пад вялікім пытаннем. Калі ў якасці аргументу ўжываецца гумовы дручок і слезагонны газ, калі 25 сакавіка сяброў ТБМ затрымліваюць толькі за тое, што яны размаўляюць па-беларуску і маюць на грудзях значкі з афіцыйна зацверджанай эмблемай ТБМ, удзел нашай арганізацыі ў гэтым дыялогу з'яўляецца вельмі праблематычным.

Аднак, у міжнароднай практыцы перамоўны працэс ідзе ў самых розных, нават экстрэмальных, умовах. Таму ТБМ лічыць, што спачатку патрэбна тым сілам на чале з А.Лукашэнкам, якія 1 сакавіка выйшлі з ініцыятывай пачатку грамадскага дыялогу, засведчыць наступныя палажэнні і прынцыпы:

1) Дыялог грамадска-палітычных сілаў не павінен замяніць сабою перамовы паміж уладамі і апазіцыяй, аб правядзенні якіх было абвешчана ўлетку мінулага году пасля Санкт-Пецярбургскай сесіі Парламенцкай Асамблеі АБСЕ.

2) Беларускія ўлады напярэдадні дыялогу вяртаюцца да рэалізацыі пунктаў дамовы паміж экспертнымі групамі прадстаўнікоў улады і апазіцыі аб умовах допуску прадстаўнікоў апазіцыі да дзяржаўных сродкаў інфармацыі.

3) Усе ўдзельнікі дыялогу маюць таксама гарантаваны доступ да дзяржаўных СМІ, што павінна быць абумоўлена адпаведнымі пунктамі рэгламента дыялогу грамадска-палітычных сілаў Беларусі.

Як мы мяркуем, да ўсяго ўлады мусяць публічна прасіць выбачэнняў у тых людзей, якія былі незаконна затрыманыя 25 сакавіка, і пакараць вінаватых у гэтым. Добры пачатак гэтай справы – афіцыйныя выбачэнні МУС расійскім журналістам. Але дасюль гэтага не было зроблена ў дачыненні да простых грамадзянаў нашай краіны, беларускіх і іншых замежных журналістаў, а таксама дыпламатычных асобаў. З чаго вынікае, што іх беларускія ўлады лічаць за людзей другога гатунку.

Такім чынам, пакуль вышэйпазначаныя патрабаванні не будуць выкананыя, ТБМ перапыняе свой удзел у распачатым дыялогу.

29 сакавіка 2000 г.

Старшыня ГА ТБМ імя Ф.Скарыны Алег Трусаў.

## Рэспубліканская рада ТБМ

***Падобна на тое, што "Вясна – 2000" не скончыцца ні 26 - га красавіка, ні 1–га траўня.***

Чарговае паседжанне Рэспубліканскай рады ТБМ адбудзецца 16 красавіка 2000 года аб 11 гадзіне на пляцы Незалежнасці ў дольнай зале Чырвонага касцёла.

Парадак дня:

1.Справаздача аб дзейнасці ТБМ за год з 17.04 1999 г. да 17.04.2000 г. (дакладае Алег Трусаў, старшыня ТБМ).

2. Абмеркаванне і прыняцце канцэпцыі і статута Беларускага Нацыянальнага Універсітэта.

***3. Аб правядзенні масавых акцый пратэсту з нагоды 5-х угодкаў травеньскага рэферэндуму 1995 года.***

4. Рознае.

Пасля правядзення Рэспубліканскай рады будуць праведзены Берасцейская і Гомельская абласныя канферэнцыі.

Сакратарыят ТБМ.

## Ліда. Адзін маленькі горад супраць несправядлівасці

**Тое, што адсутнасць на Беларусі хаця б аднай вышэйшай навучальнай установы, якая працавала б цалкам на беларускай мове з'яўляецца абсурднай недарэчнасцю пачынаюць разумець, здаецца, усе: ад усякай-усялякай апазіцыі да самых, да крайніх камуністаў. У горадзе Лідзе вядзецца масавая акцыя збору подпісаў за БНУ. У гэтую сераду мяне, як рэдактара газеты і старшыню Лідскай гарадской рады ТБМ выклікалі ў Лідскі райвыканкам з–за тога што ў газеце было надрукавана, што быццам бы 70 супрацоўнікаў Лідскага райвыканкама падпісалася за адкрыццё БНУ (Беларускага Нацыянальнага Універсітэта). Мяне папрасілі ўдакладніць, што гэта было ўсяго 47 супрацоўнікаў аддзела адукацыі Лідскага райвыканкама. Я не ведаю ці ў іх ёсць тыя 47 супрацоўнікаў, там падпісвалася шмат прыезджых з вёсак, якія выпадкова аказаліся ў гэты час у райвыканкаме, але даводжу, што разам з прабачэннямі за магчымую недакладнасць мушу паведаміць: жыхарамі Лідскага раёна па Лідзе і вёсках за пяць тыдняў сабрана 797 подпісаў за БНУ. Усяго ў выніку Лідскай акцыі сабрана пакуль 4665 подпісаў, здадзеных мне асабіста. На руках яшчэ каля васьмі соцень сабраных подпісаў і бланкаў на некалькі тысяч. Паведамляю, што нам без розніцы, хто і дзе падпісвае. Тут ёсць подпісы і з Маладэчна, і з Горадні і з Глыбокага, але вязуць іх у Ліду. Паведамляю, што заўтра ці паслязаўтра па Лідзе пойдуць апытальнікі з дыктафонамі, якія заміж подпісаў будуць пісаць выказванні "за" ці "супраць" БНУ. Касеты будуць здавацца нараўне з подпісамі ў сядзібу ТБМ. Гэты метад адпрацаваны мала. Вынікаў мы, проста, пачакаем.**

**Далейшыя матэрыялы па праблеме БНУ чытайце на ст. 2.**

**Станіслаў Суднік.**

## *ЗАЯВА*
## *БНФ "Адраджэньне" і Партыі БНФ*

**25 Сакавіка 2000 году — працяг Змагарнага Чыну**

Як штогод, незалежніцкія сілы Беларусі адзначылі галоўнае свята беларускага народа — Дзень Волі 25 Сакавіка — урачыстасцямі па ўсёй краіне. У 21 горадзе Беларусі адбыліся акцыі ў гонар Дня Волі. У Горадні на святочную дэманстрацыю выйшла 3000 чалавек, ад некалькіх соцень да тысячы – у Берасці, Салігорску, Слоніме, Маладэчне ды іншых гарадах. Але памкненні беларускага народу да незалежнасці выклікаюць шалёную нянавісць лукашэнкаўскага рэжыму і яго расейскіх гаспадароў. Сёлета 25 Сакавіка ў Менску за незалежнасць зноў пралілася кроў.

Гарадскія ўлады, напачатку гатовыя паразумецца з арганізатарамі святочнага шэсця і мітынгу, урэшце на прамы загад Лукашэнкі насуперак закону забаранілі шэсце. Яшчэ раз пацвердзілася, што менчукі не маюць сваёй гарадской улады, а толькі паслухмяную ўзурпатару "вертыкаль". Гарадская міліцыя, якая пачала выпраўляць сваё аблічча 15 сакавіка, на гэты раз зноў вымушаная была выконваць брудную работу, хоць асноўныя заплечныя функцыі былі ўскладзеныя на іншыя сілавыя структуры. На задушэнне незалежніцкага святкавання былі кінутыя беспрэцэдэнтныя сілы і рэсурсы. На вуліцы Менска былі выведзеныя ўзброеныя жаўнеры нутраных войскаў, панцырная тэхніка, вадамёты, амапаўцы з сабакамі. Гэта не пакідала сумневаў у тым, што Менск акупаваны.

Асаблівую нянавісць антыбеларускага рэжыму выклікала незалежніцкая пазіцыя БНФ "Адраджэньне". Сядзіба БНФ на вуліцы Варвашэні, 8 была заблакаваная з самае раніцы сіламі АМАПу і нутраных войскаў ды некалькі разоў штурмаваная (у выніку ёсць параненыя). Усіх, хто ўваходзіў у сядзібу або выходзіў з яе, тут жа затрымлівалі і вывозілі.

25 сакавіка яшчэ да пачатку акцыі былі беспадстаўна арыштаваныя кіраўнікі і сябры БНФ Віктар Івашкевіч, Сяргей Міхноў, Сяргей Андросаў, Уладзімір Юлюкевіч, Вадзім Болбас, Алесь Пушкін, Алесь Бондараў, Рыгор Кійко, сябры кіраўніцтва АГП, КХП, БСДП Анатоль Лябедзька, Юрась Беленькі, Алесь Чахольскі, Віталь Малашка, сотні іншых палітычных актывістаў, замежныя журналісты, а нават абароненыя дыпламатычнаю недатыкальнасьцю чалец Кансультацыйна-назіральнай групы АБСЕ Крыстафэр Паніка і пасол (дэпутат) польскага Сейму Мар'юш Каміньскі. Журналістаў, дыпламатаў, звычайных грамадзян звозілі ў казармы нутраных войскаў на вул. Маякоўскага, дзе размяшчалі ў спартовым комплексе, у казармы на вул. Грушаўскай, у спецразмеркавальнік на вул. Акрэсціна, а таксама ў раённыя пастарункі міліцыі. Агульная колькасць затрыманых дасягае 500 чалавек.

Перад шэсцем і падчас яго нутраныя войскі, узброеныя дубінкамі, балонамі з слезацечным газам, абароненыя шчытамі, шаломамі, нападалі на мірных безабаронных людзей. Жорстка збітыя скульптар, чалец Саюзу мастакоў і Мастацкай суполкі "Пагоня" Алесь Шатэрнік, Юрась Беленькі, Анатоль Лябедзька, параненыя многія іншыя людзі. Але, нягледзячы на зверствы служак рэжыму, два шэсці ад пляцу Якуба Коласа да месца мітынгу адбыліся, і нават зладзейскі напад узброеных сілаў нутраных войскаў не здолеў ім перашкодзіць. На мітынг, нягледзячы на рэпрэсіі, сабралася да 12 тысячаў чалавек. Выступілі тыя, каго па дарозе не схапілі: кіраўнікі БНФ Вінцук Вячорка і Вячаслаў Сіўчык, лідэры БСДП і АГП Мікола Статкевіч, Аляксандар Дабравольскі, лідэр барысаўскіх акцыяў пратэсту Алесь Абрамовіч, дачка Юрыя Захаранкі, старшыня Маладога Фронту Павел Севярынец.

Узурпатар чарговы раз спрабуе ўхіліцца ад адказнасьці, з'ехаўшы з Беларусі акурат падчас масавай акцыі пратэсту. Але адказнасць за ўчыненае панясуць і ён, і ягоны міністар Сівакоў, і ўсе, хто выконваў іхнія злачынныя загады. 25 сакавіка 2000 года рэжым Лукашэнкі кінуў усяму цывілізаванаму свету выклік, які перакрэсьліў усе ілюзіі наконт магчымага "дыялогу" з рэжымам і наконт дэмакратычных выбараў пры гэтым рэжыме.

Наступная буйная акцыя ў Менску адбудзецца 26 красавіка, у дзень гадавіны Чарнобыльскай катастрофы. Заклікаем усіх, каму дарагая будучыня нашай краіны, нашых дзяцей і ўнукаў, выйсці на вуліцы сталіцы. "Вясна-2000" працягваецца.

*26 сакавіка 2000 г.*

## Ахвяраванні на ТБМ

1.Бацькі СШ №180, г. Менск – 400 руб.
2.Гатоўскі Э.І,. г. Менск – 500 руб.
3.Кананові., г. Менск - 2.000 руб.
4.Казлоўская І.І., г. Менск – 600 руб.
5.Каліцкая А.А., г. Менск – 500 руб.
6.Гардзіевіч В.Ул., г. Масква – 550 руб.
7.Снітко Алена і Мікалай, г. Лондан – 100$
8.Суполка ТБМ "Рэфармацыя", г. Менск - 1.000 руб.
9.Міцкевіч У.В., г. Менск – 5.000 руб.
10.Міцкевіч В.В., г. Менск – 5.000 руб.
11.Ляўчук Міхаіл Пятровіч, г. Менск – 6.000 руб.
12.Талуць С.Ф., г. Гомель, - 1.000 руб.
13.Брыль Янка, г. Менск --1.000руб.
14.Кручак Сымон і Алена, г. Менск – 3.000 руб.
15.Мішчук Георгій, г. Менск – 3.000 руб.
16.Петруковіч Васіль, г. Менск – 900 руб.
17.Кучанкоў Пётра, г. Гародня – 500 руб.
18.Бойчанка Д.П., г. Менск - 1.000 руб.
19.Мікола Дзямід – 2.000 руб.
20.Галай Аркадзь, г. Менск – 1.000 руб.
21.Валошчык Лідзія Рыгораўна, г. Менск - 1.000 руб.
22.Валошчык Мікалай Антонавіч, г. Менск - 1.000 руб.
23.Згуртаванне беларусаў "Бацькаўшчына" Севастопаль --50 укр. гр.
24.Сябры ТБМ з Польшчы --10 DM




№ 14 (451) 5 КРАСАВІКА 2000 г. НАША СЛОВА

# "Закон аб мовах – вынікі і перспектывы"

Даклад, падрыхтаваны да навукова-практычнай канферэнцыі "Закон аб мовах -- вынікі і перспектывы" 26 лютага 2000 года

Закон аб мовах, прыняты ў перабудовачны час, сапраўды з'яўляецца законам, які ўзяў пад абарону не толькі беларускую, але і мовы нацыянальных меншасцяў, якія пражываюць на нашай зямлі. У ім падкрэслена, што "мова – не толькі сродак зносін, а і душа народа, аснова і важнейшая частка яго культуры". І гэта, бадай, самае галоўнае. Змяняючы мову, грамадства змяняе і культуру. Мы бачым, якіх вынікаў дасягнула "руская культура" ў выглядзе той штучнай рус-кай мовы, якая запанавала зараз у паўсядзённым абіходку: такой колькасці нецэнзурных мацюкоў не ўжывалі ў нас ніколі. Гэта адчуваюць нават дзеці. Вось што піша вучань 7-га класа нашай школы: ***"Бывае вельмі балюча да слёз, што расіяне гавораць на рускай мове, украінцы – на ўкраінскай, а мы, беларусы, не карыстаемся сваёй роднай мовай, мовай чыстай і мілагучнай, якая ліецца, як ручаёк. У нашай мове няма ніводнага дрэннага слова"...*** Так, змагаючыся за нацыянальнае адраджэнне Закон аб мовах змагаецца і за адраджэнне культуры, душы чалавека, якая здольная адгукацца на ўзвышанае і роднае. Якая павінна любіць. І як бы нам ні казалі, што "любіце ж сваю зямлю, хто ж вам забараняе, пры чым тут мова?" Але ўсё гэта падман. Людзі не прыдумалі яшчэ іншай, больш святой любові, чым любоў да Бацькаўшчыны. Усё роднае трэба любіць, а не зневажаць. Значыць, Закон аб мовах узяў пад абарону Яе Вялікасць – Любоў, супрацьпаставіўшы яе здрадзе. Успомнім Купалу, які пісаў пра "сон" беларусаў. Прабуджаючы любоў у душы да роднага, Закон спрыяе адраджэнню гэтай душы. Калі ж свядомы беларус стане задумвацца над пытаннем існавання роднай мовы, ён зможа прыйсці да такой высновы, як (зноў прывяду прыклад з вучнёўскага сачынення)... "Наша мова прыйшла да нас "з легендаў і казак былых пакаленняў, з калосся цяжкога жытоў і пшаніц". Яна "выткана" з "сузор'яў і сонечных цёплых праменняў", "з птушынага шчэбету, з шуму дубровы". Наша мова прызнана другой у свеце па мілагучнасці. Дык чаму ж мы не шануем яе? Усе народы размаўляюць на сваёй мове, а мы? ***Мы як бы знішчаем сваю мову. А тых, хто цураецца свайго роднага слова, называюць здраднікамі. Чаму на нашай зямлі столькі здраднікаў?!. Чаму наша мова знікае?!. У гэтым вінаваты толькі мы! Колькі нам быць здраднікамі?!. Лепей будзем шанаваць родную мову!"***- заканчвае сачыненне сямікласніца. І з ёю нельга не пагадзіцца. Ва ўсіх народаў слова "здрада" азначае адыход ад Бацькаўшчыны, ад спадчыны.

Закон аб мовах нясе ў сабе вялікую энергетыку любові, якая здольная разбудзіць заснуўшую свядомасць нацыі. Успомнім Купалу, які пісаў, што ніводнае ў свеце адраджэнне не пашырылася з такой хуткасцю, як беларускае. І я лічу, тут трэба даць права на голас нашай Мове. Яна зможа прабудзіць любоў, а не насілле, не гвалт, не пошасць, а запаліць "сонца" ў душах людзей. Мы зараз чуем, як цяжка ўсім стала жыць, як многа чэрствасці і здрады сярод людзей, як шмат нявер'я. А гэта ўсё можна наўпрост звязаць са здрадай многіх беларусаў сваёй мове.

Закон аб мовах абараняе мовы нацыянальных меншасцяў краіны. Згадзіцеся, як няпроста зараз вырашаецца нацыянальнае пытанне ў рускамоўным асяродку Беларусі. Слова "яўрэй" стала ледзь не мянушкай, "татарын" саромеецца назвацца Мустафой, і вучні школы называюць яго Іванам Сцяпанавічам, крыху больш пашанцавала Саюзу палякаў, бо дарога ў Польшчу для многіх стала зараз "дарогай жыцця".

Закон аб мовах быццам падслухаў тое, аб чым здаўна марылі беларускія людзі. Я.Купала пісаў: "Беларуская нацыя – добрая нацыя. Нават у песнях сваіх беларусы нікога не крыўдзілі". Змагаючыся за адраджэнне нацыянальнай свядомасці нацыянальных меншасцяў Беларусі, Закон аб мовах тым самым дапамагае і карэннаму насельніцтву падтрымаць веру ў сябе, у моц свайго нацыянальнага духу, бо беларус, на словах Дастаеўскага, "выратуецца верай у сябе". І ў гэтых словах пісьменніка падкрэслена высокая значнасць, годнасць, моц і культура беларускай нацыі. Гэта добра ўсвядомілі ворагі Беларушчыны. Яны прыніжаюць роднае слова, культуру народа, сеючы нявер'е беларуса ў сябе. Закон аб мовах будзе мёртвы, калі яго не будуць праводзіць у жыццё людзі. Галоўная задача якіх – выхаванне гонару за свой народ, вяртанне яму гістарычнай памяці. У гэтым асноўнае прызначэнне і нашага грамадскавга аб'яднання ТБМ. Нам трэба будзіць свядомасць беларусаў, часцей закідаць зерняткі любові, а не нянавісці ў душы людзей. Нам трэба зараз выступаць у ролі апосталаў, якіх няверныя могуць і каменнем закідаць, і зганьбіць, і абсмяяць. Але пакуты свядомых барацьбітоў за веру ў свой край, яго мову будуць святымі. І хоць нешта святое з'явіцца ў нашым нялёгкім жыцці. І гэта сапраўдная святасць, а не фарысейская, бо няма нічога больш святога, як любоў да Бацькаўшчыны. Аб тым, як патрэбна беларусам вера ў сябе, сведчаць наступныя радкі з сачынення вучаніцы нашай школы: "Аднойчы на аўтобусным прыпынку стаялі хлопец і дзяўчына, яны размаўлялі па-беларуску. Усе на іх глядзелі і саромеліся, а адна жанчына нават спытала: "Вы што, з Народнага Фронту?! – "Не, мы з Беларусі", - адказаў хлопец. І раптам людзі загаварылі: "І сапраўды (сказала адна жанчына), чаму гаварыць па-беларуску лічыцца некультурным? Прыгожая ж мова..." Што можна сказаць пра гэтае сачыненне? Відаць, адказ можна знайсці ў другім сачыненні другой вучаніцы, якая піша: "Чаму мы, беларусы, цураемся сваёй беларускай мовы? Напэўна, мы нават самі не разумеем гэтага і таму не можам на гэта адказаць". Вось чаму я і бачу задачу ТБМ перш за ўсё не ў крыклівых прамовах аб тым, як зневажаецца наша мова. Гэта трэба таксама рабіць, але тут можна самім сабе нашкодзіць. Галоўная ж наша праца – асветніцкая. У школах, у сродках масавай інфармацыі, у паўсядзённым жыцці несці людзям праўду аб нашай мове, каб вера беларуса ў сябе ўмацоўвалася. Тут да месца вельмі ведаць вершы аб мове, выказванні нашых знакамітых паэтаў, якія змогуць адразу засведчыць несвядомаму слухачу высокую культуру нашай мовы і нацыі. Хачу зноў спаслацца на сачыненне школьніцы, вось што піша Макей Вольга з нашай школы: "Аднойчы мы сядзелі з сяброўкамі на лаўцы каля нашага дома. Мы размаўлялі, гаворачы аб тым, якія вершы нам падабаюцца. І тут мая сяброўка расказала свой любімы верш:

- Дзе мой край?
- Там, дзе вечную песню пяе Белавежа,
- Там, дзе Нёман на захадзе помніць варожую кроў...
- Пачакай, пачакай... - перабівае дзяўчынку Насця і гаворыць, што самы добры верш – гэты:
- Над Москвой великой, златоглавой,
- Над стеной великой, белокаменной...

... І тут Насця спынілася, бо мы так на яе паглядзелі, што нашыя вочы сталі па капейцы. Мы так і не зразумелі, пра што дзяўчынка расказвала. А ў нашых беларускіх вершах – любоў, святыня, чысціня. А там сцены нейкія белыя. Так мы сядзелі да вечара, расказваючы свае любімыя беларускія вершы хорам". Мне здаецца, што Закон аб мовах моцны тым, што ён падтрымлівае нацыянальную свядомасць, спрыяе развіццю моў усіх нацыянальнасцяў, якія насяляюць нашу краіну. І ў гэтым доўгая жывучасць і трываласць Закона аб мовах. Лічу, што ён павінен і далей працягваць сваю дзейнасць, толькі грамадскія аб'яднанні, у тым ліку і ТБМ, мусяць спрыяць таму, каб закон ажыццяўляўся.

Хочацца закончыць сваё выступленне ўрыўкамі з сачыненняў дзяцей: "Чалавека цягне на Радзіму, каб усімі грудзьмі ўздыхнуць водар валожкі, пабыць ў полі і пачуць, як размаўляе жыта, як шэпча крыніца, убачыць, як падаюць зоры. Таму беларускую мову не выкараніш, як не выкараніш любоў. І нават жывучы за гарамі і лясамі, мова ляціць да цябе бад белымі ветразямі Радзімы, якая завецца Белай Руссю".

Давайце ж рабіць усё, што мы ў сілах рабіць, каб горы і лясы, якімі адмежавана нашая мова ад народа, былі знішчаны, і мова знайшла шлях да сэрцаў беларусаў, сцежку "да сонца і зор залатых".

***Трафімчук Т.У.,***
***г. Слонім, старшыня гарадской суполкі ТБМ.***

**Абмяркоўваем канцэпцыю Беларускага нацыянальнага універсітэта.**

# Праграма "Беларускі падручнік".

На фоне ўсебеларускага пад'ёму ў зборы подпісаў за Беларускі нацыянальны універсітэт асабняком стаіць горад Горадня, дзе быў пакладзены пачатак стварэння Таварыства беларускай вышэйшай школы (ТБВШ). У Горадні слабавата актывізуецца збор подпісаў за БНУ. У рэдакцыю іх паступілп за пяць тыдняў роўна 13). На першы погляд гэта можна было патлумачыць звычайнай беларускай абыякавасцю па-прынцыпу: вам трэба – вы і рабіце. Разам з тым мая гутарка з кіраўнікамі ТБВШ высвеціла некалькі іншы малюнак. Аказваецца яны не зусім згодны з падыходам: "Даеш універсітэт". Мне ўпарта даказваюць, што спачатку трэба падрыхтаваць кадры надрукаваць беларускія падручнікі па ўсіх прадметах, а пасля ўжо гаварыць пра БНУ. Парыруючы гэты выпад я мусіў давесці: менчане высунулі ідэю БНУ, гарадзенцы высунулі праграму "Беларускі падручнік", а што мы маем на сёння. Па ўсёй Беларусі ідзе збор подпісаў за БНУ. Адна Ліда сабрала больш 5 тысяч. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь паверылі ў рэальнасць ідэі БНУ і пачалі працаваць на яе.

Пакуль я пішу гэтыя радкі шмат чаго можа змяніцца, але я мушу сказаць наступнае.

Вяртаючыся да ўжо згаданай праграмы "Беларускі падручнік", я звярнуўся да аўтараў гэтай ідэі з просьбай перадаць напрацоўкі ў аргкамітэт Універсітэта, ці ў газету "Наша слова" для апублікавання. Аказалася, што па гэтай праблеме не напісана ні радка. Уся праграма знаходзіцца толькі ў галовах некалькіх чалавек.

Магчыма я мыляюся, то з задавальненнем папрашу прабачэння, але сёння інфармацыя такая.

Таму я мушу выказаць свой пункт гледжання на далейшы развой працы ў напрамку стварэння БНУ.

Я ніколі не быў рэктарам ці дырэктарам нейкай навучальнай установы, таму ахвотна прыму ўсе заўвагі да таго, што будзе сказана далей, але я 9 гадоў вучыўся ў вышэйшых навучальных установах і 20 гадоў выкладаў самыя розныя прадметы ад марксізму-ленінізму да стэнаграфіі і нейкі досвед усё-такі маю. Вось мае разважанні.

Канцэпцыя БНУ надрукавана. Я яе моцна кранаць не буду. Гэта пад час абмеркавання зробяць больш дасведчаныя людзі. Але апублікаваўшы гэтую канцэпцыю мы сказалі толькі "А" у справе стварэння БНУ. Сказалі гучна, так што пачула нават БТ. У адказ на тыя дзесяткі тысяч подпісаў, якія паступаюць у падтрымку БНУ мы проста абавязаны сказаць "Б".

Гэтае "Б" мне бачыцца ў наступным выглядзе:

І. Арганізацыйна-адміністратыўныя мерапрыемствы.

Канцэпцыя канстатавала факультэты і аддзяленні. Што далей? Далей ТБМ мусіць на грамадскіх пачатках прызначыць дэканаў факультэтаў і загадчыкаў кафедр, павінен быць сфармаваны дзейны калектыў БНУ, які арганізуе рэальную працу.

ІІ. Арганізацыйна-інтэлектуальныя мерапрыемствы.

Тут мне бачыцца чатыры этапы.

1.Па ўсіх факультэтах і кафедрах распісаць усе прадметы навучальнай праграмы пагадзінна ўсе 5 гадоў навучання. Гэтая праца, наколькі мне вядома, ўжо зроблена на прыродазнаўчым факультэце, дзе працу ўзначальвае акадэмік Радзім Гарэцкі.

2.Распрацаваць навучальныя праграмы для першых курсаў усіх факультэтаў і аддзяленняў.

3.Распрацаваць і выдаць курсы лекцый для першых курсаў, каб забяспечыць будучых студэнтаў літаратурай.

4. І, нарэшце прыступіць да поўна-маштабнай праграмы "Беларускі падручнік", рэалізацыя якой мне бачыцца таксама ў два этапы.

а) Рэалізацыя праграмы беларускі падручнік канкрэтна для БНУ, у рамках і разрэзе запатрабаванняў менавіта гэтай ВНУ і для забяспячэння высокаякаснымі падручнікамі менавіта гэтай ВНУ.

б) Глабалізацыя праграмы: распаўсюджанне яе на ўсе ВНУ Беларусі, на ўсе навучальныя прадметы і дысцыпліны, каб беларускі падручнік прыйшоў нават туды, дзе выкладанне ідзе па-расейску, бо ў гэтым выпадку ён зробіць сваю справу і пахіліць шалі вагаў у бок беларускасці.

А зараз пра рэальнасць і мэтазгоднасць такіх дзеянняў.

Супраціўнікі і апаненты БНУ больш за ўсё баяцца менавіта практычнай дзейнасці. Нікога не краналі нашы "мудрыя" разважанні пра беларускамоўную вышэйшую адукацыю пакуль мы не перайшлі да практычных крокаў. Наступныя нашы крокі будуць выклікаць яшчэ большую рэакцыю. Пры гэтым гэтая рэакцыя будзе, як у выглядзе супрацьдзеяння, так і ў выглядзе кампрамісаў, бо сама ідэя БНУ настолькі дэпалітызаваная, простая і зразумелая, настолькі прагматычная, што выступаць супраць яе ў лоб – гэта значыць выстаўляць сябе ў абсалютна нявыгадным святле, асабліва пасля апошняга перапісу.

З'яўленне праграмаў, курсаў лекцый для першых курсаў, далейшая праца над аналагічнымі праграмамі і курсамі для старэйшых курсаў пераводзіць усю ідэю БНУ з віртуальнай прасторы ў самую, што ні ёсць рэальную. Адпадуць пытанні, якія падняло БТ, а хто будзе выкладаць, а па чым будуць навучаць і г.д., адпадуць сумленні ў магчымасці беларускай эліты зрабіць канкрэтную справу, а што менавіта ў сферы адукацыі зканцэнтравана асноўная маса нацыянальнай эліты гэта вядома кожнаму. Таму БНУ і ёсць той асялок на якім будзе праверана дзеяздольнасць эліты.

І, нарэшце, пра практычныя магчымасці. У аргкамітэт БНУ ўваходзіць ужо некалькі соцень дактароў і кандыдатаў навук. Яшчэ больш проста падтрымлівае гэтую ідэю. Таму не можа быць праблем ні з фармаваннем факультэтаў, ні з напісаннем праграмаў, ні з напісаннем курсаў лекцый, ні з падрыхтоўкай падручнікаў. На сёння не прынцыпова, ці будуць гэта аўтэнтычныя курсы і падручнікі, ці гэта будуць пераклады лепшых сусветных узораў. Пазней, у ходзе развіцця БНУ мы зможам перайсці да цалкам аўтэнтычных курсаў, а пакуль патрэбна практычная гатоўнасць да працы.

Зараз, што тычыцца выдання курсаў лекцый. Гэтая праблема таксама вырашальная. Канкрэтныя шляхі яе вырашэння будуць разгледжаны на адным з больш позніх паседжанняў аргкамітэта БНУ, пасля таго, як вымалююцца контуры велічыні гэтай працы. Кожны разумее, што выданне запатрабуе значных грошай. Укладваць грошы ў віртуальную ідэю ніхто не будзе, таму рэалізацыя выдання цалкам залежыць ад таго наколькі мы прасунемся да практычнай рэалізацыі самой ідэі БНУ. Але на той момант у шуфлядзе павінна быць усё.

І вяртаючыся да праблемы "Беларускі падручнік". Як мне падаецца, калі аўтары ідэі пагодзяцца з маім падыходам, то самы час даверыць паперы гэтую праграму хаця б у разрэзе этапа а), г.зн. у дачыненні менавіта да БНУ.

**Станіслаў Суднік.**

## ТБМ імя Ф. Скарыны

***Гарадзенскае абласное грамадскае аб'яднанне "Ратуша" падтрымлівае ідэю стварэння Беларускага Нацыянальнага Універсітэта і бярэ на сябе абавязак забяспечыць друк 20 падручнікаў дзеля гэтай мэты.***

***Дадатковыя выданні могуць быць выкананы ў рэсурсавых цэнтрах Берасця, Гомеля і Віцебска.***

***Старшыня аб'яднання "Ратуша"***
***Старшыня Беларускай Асацыяцыі Рэсурсавых Цэнтраў А. Мілінкевіч.***



# Наша мова для нас святая

**Фотарэпартаж з вечарыны ў гонар Францішка Багушэвіча 21 сакавіка 2000 года**







**Як ужо паведамляла "Наша слова", 21 сакавіка адбылася вечарына ў гонар 160 угодкаў вялікага беларуса Францішка Багушэвіча. Сёння мы прапануем фотарэпартаж з гэтай імпрэзы. На здымках макет помніка Францішку Багушэвічу, які будзе пастаўлены ў Смаргонях і ўдзельнікі вечарыны Уладзімір Содаль, Леў Гумілеўскі, Міхась Жданоўскі, Алесь Лось,Вячаслаў Статкевіч, гурт "Госціца", Марыя Новікава ды ўсе іншыя.**

**Здымкі Дядзечкіна**

**Станіслаў Суднік**

# Кроў Францішка

**Балада**

Шумяць над Дайноваю пушчы,
Легенды лістотай складаюць,
Ад зорак нябесных відушчых
Зямныя таемствы хаваюць.

Хаваюць Дайновы дубравы
Малойцаў адважных і смелых,
Хаваюць іх мужныя справы,
Хаваюць іх спрытных, умелых.

Шумяць вершалінамі хвоі,
А ўнізе самотная ціша,
Пад хвояй сцякае крывёю
Хлапец -- Багушэвіч Францішак.

Паранены ў бітве за волю,
Да лідскай зямлі прытуліўся,
І болей не чуючы болю,
Ён гэтай зямельцы маліўся:

"Зямелька, зямелька Айчыны,
Ты моцай адвечнай святая,
Ад кроплі дажджынкі адзінай
Жыццё на табе расцвітае.

А я ж цябе сёння крывёю
Гарачай сваёй паліваю
І думкай заняты адною,
Каб вырасла, што пажадаю.

Каб выраслі туг тыя людзі,
Што волю здабудуць краіне,
Што край ад дрымоты разбудзяць,
Што стануць народам адзіным.

Каб выраслі тыя героі,
Што мову сваю абароняць
І ў хвілю цяжкую сабою
Айчыну ад злыдняў заслоняць..."

Маліўся Францішак хлапчына,
І кроў струмяніць перастала,
І ціха Зямелька - Айчына
Яму на адказ прашаптала:

"Устань жа, ідзі і змагайся,
Нясі сваё слова народу,
Не кайся ні ў чым, не хістайся,
Бо з словам нясеш ты свабоду.

Бо толькі, як вольнае слова
Над краем тваім залунае,
Спадуць ланцугі і аковы,
І сонца свабоды заззяе".

Падняўся хлапец, не хіснуўся
І з мовай мужыцкай сваёю
Да вёсак засценкаў памкнуўся,
Акрылены сілай святою.

Дайшоў ён да прызбаў і хатаў,
Дайшоў ён да думак і сэрцаў,
Ён слова смычком струны кратаў
Тых душ, што чазлі ў паняверцы.

Дайшоў, пабудзіў і паклікаў,
І слова, як сцяг, даў народу,
І марай акрылю вялікай,
І шлях паказаў да свабоды.

А там, дзе ў вайсковым паходзе
Пад Лідай цякла кроў святая,
Што год праз другое стагоддзе
Кусточак суніц вырастае.

І варта каму там суніцу
Сарваць, як адкуль што бярэцца,
Па іншаму думка бруіцца,
Па іншаму стукае сэрца.

І кліча цябе тое слова,
Што клікала хлопца паўстанца,
І просіць цябе тая мова
На новую бітву ўздымацца.

Што год вырастаюць суніцы,
Што год іх народ тут збірае,
Што год, як з жывое крыніцы,
Ён сілы ў сябе набірае.

Што год узрастаюць лідзяне,
Што год устаюць да паходу
І рушаць па шляху змагання
За мову, за край, за свабоду.

# СІНАГОГІ І МЯЧЭЦІ ГАРАДЗЕНШЧЫНЫ

Упершыню аседлае габрэйскае насельніцтва з'явілася на Беларусі ў канцы XIУ ст. у часы Вітаўта. Першыя габрэйскія супольніцтвы ўзніклі ў Бярэсці і Горадні. Інтэнсіўная міграцыя габрэяў на Беларусь адбылася ў XУI ст. з Германіі праз Польшчу і паступова распаўсюдзілася да ўсходніх межаў ВКЛ. У гэты час габрэйскія паселішчы ператварыліся ў юрыдычныя супольніцтвы з кагальнай арганізацыяй. Першыя кагалы з'явіліся ў тых беларускіх гарадах, што мелі Магдэбургскае права. Кагал адказваў перад уладамі і хрысціянскім насельніцтвам за ўсіх сяброў габрэйскага супольніцтва. Ён плаціў падаткі, здзяйсняў суд у спрэчках паміж габрэямі, адказваў за будаўніцтва сінагог і малітоўных дамоў, а таксама ўтрымліваў могілкі.

На тэрыторыі Беларусі існавалі таксама габрэйскія духоўныя семінарыі (ешыботы) (Валожын, Магілёў, Ліда) і талмудыцкая акадэмія (іешыва) у Міры.

Спачатку сінагогі ў габрэяў ВКЛ былі драўлянымі. Беларускі даследчык Аляксандр Лакота лічыць, што для беларускіх драўляных сінагог уласціва адзінства вобразу, які створаны адмысловым аб'ёмнапрасторавым вырашэннем. Галоўнае ў такім вырашэнні – пераход прасторавага рытуальнага памяшкання ў шатровы дах складанай формы. Абхадныя галерэі і прыбудовы звычайна паўтараюць у паменшаным выглядзе форму асноўнага аб'ёму.

Першыя мураваныя сінагогі на Беларусі былі пабудаваныя ў Бярэсці (1568 г.) і Горадні (1578г.). У гэтыя часы найбольш пашыраным тыпам сінагогі быў рэнесансавы, простакутны ў плане зальны аб'ём, перакрыты цыліндрычнымі скляпеннямі з распалубкамі. У пачатку XУII ст. склаўся новы тып сінагогі, што спалучаў рысы рэнесансу і барока (Стары Быхаў, Пінск, Наваградак).

У 1642 годзе ў гістарычным цэнтры Слоніма таксама была ўзведзеная мураваная сінагога ў стылі архітэктуры барока. Кампактны будынак мае выгляд базілікі з квадратным у плане аб'ёмам, да якога з трох бакоў дастасоўваецца больш нізкія аб'ёмы дапаможных памяшканняў. Бажніца пакрыта двухспадавым дахам. Галоўны фасад мае франтон складанага пластычнага абрысу і аздоблены рознымі дэкаратыўнымі дэталямі. Цэнтральная зала перакрытая сістэмай скляпенняў і мае ў сярэдзіне чатыры слупы выкол бімы.

У пачатку XУII ст. з'яўляецца новы цэнтрычны тып дзевяціпольных сінагог, у якім спалучыліся рысы рэнесансу і барока. У гэтых сінагогах катэдра была канструктыўнай і кампазыцыйна звязаная са структурай інтэр'еру. У цэнтры квадратнай залы знаходзіліся чатыры слупы, на якія абапіраліся скляпенні. Перакрыццё над цэнтральным аб'ёмам, дзе была катэдра, знаходзілася значна ніжэй за іншыя. Падобнае архітэктурнае вырашэнне, акрамя абарончай бажніцы ў Старым Быхаве, мелі сінагогі ў Пінску (1640г.) і Наваградку (1642 г.), у якіх рысы рэнесансу пераважалі.

Будаўніцтва мураваных сінагог працягвалася на Беларусі і ў XIX – пачатку XX ст. Знешне аблічча будынкаў спачатку адпавядала рысам класіцызму, а потым і мадэрну. Яскравыя прыклады архітэктуры класіцызму – гэта мураваныя бажніцы ў Ашмянах і Століне. Фасады ашмянскай сінагогі аздобленыя сціплымі лапаткамі і шматпрофільным цагляным гзымсам пад дахам пабудовы. Прастакутны аб'ём цэнтральнага памяшкання перакрыты трохпрыступкавым дахам чатырохсхільнай формы. Архітэктурнае аблічча столінскай сінагогі яшчэ больш сціплае. Будынак узведзены ў 1792 г. Гэта прастакутная аднапавярховая двухсветлавая бажніца, унутраная прастора якой падзеленая двума шэрагамі калонаў на тры нефы.



**Сінагога ў Ашмянах**

У XIX – пачатку XX ст.ст. на Гарадзеншчыне будуецца шмат драўляных сінагог. На жаль, ніводная з іх не захавалася. Да нас дайшлі толькі старыя малюнкі і фотаздымкі. Фотаздымак сінагогі ў Воўпе (пад Ваўкавыскам) сведчыць аб спалучэнні ў яе архітэктуры рысаў архітэктуры мясцовага барока з усходнімі традыцыямі (гэта шмат'ярусныя дахі з прыўзнятымі краямі, арачныя галярэі і г.д.).

Гэтыя ж рысы можна прасачыць на фотаздымках гарадзенскай драўлянай сінагогі XУIII ст. Але тут ужо ёсць рысы і ранняга класіцызму: вертыкальныя пілястры і прастакутныя праёмы вокнаў. Элементы класіцызму можна прасачыць і ў аздабленні ашаляваных фасадаў сінагогі канца XУIII ст. у Сапоцкіне.

Апошні ўсплеск мураванага дойлідства беларускіх сінагог прыпадае на канец XIX – пачатак XX ст..

Адна з самых цікавых пабудоваў гэтага часу – гарадзенская сінагога, збудаваная ў гістарычным цэнтры горада, недалёка ад Старога Замка. Зараз гэта помнік архітэктуры неарускага стылю з элементамі мадэрну. Вялікі цагляны трохпавярховы будынак накрыты двухспадным дахам і мае квадратны план. Галоўны фасад сінагогі аздоблены квадратнымі ў сячэнні вежамі, кілепадобнымі завяршэннямі і чатырохспадавымі купаламі з ажурнымі металічнымі агароджамі-парапетамі наверсе. Усе фасады пакрыты рустоўкай. Ваконныя праёмы маюць лучковую і арачную форму і кілепадобныя ліштвы. Бажніца перакрыта крыжовымі нярвюрнымі скляпеннямі. Інтэр'ер бажніцы мае шыкоўны ляпны дэкор.



**Сінагога і ешыбот у Лідзе.** *(Здымак даваенны.)*

Беларускія татары масава з'явіліся на Гарадзеншчыне амаль адначасова з габрэямі ў XIУ ст. Яны належаць да мусульман-сунітаў адпаведнага кірунку, які быў заснаваны арабскім тэолагам УIII ст. Абу-Ханіфам.

Зараз найбольш буйная татарская суполка на Беларусі, якая вядзе свой радавод ад пачатку XУ ст., знаходзіцца ў Іўі. Іўеўскія татары трапілі на Гарадзеншчыну з тэрыторыі Прыазоўя. Адсюль яны прынеслі ўнікальную культуру агародніцтва. Татарскія суполкі існуюць і ў іншых месцах Гарадзеншчыны: у вёсцы Лоўчыцы каля Наваградка, у мястэчку Мір, а таксама і ў буйных гарадах – Наваградку, Горадні і Слоніме. У адрозненні ад сінагог усе мячэці на тэрыторыі Гарадзенскай вобласці былі драўляныя, аднак некаторыя з іх захаваліся часткова альбо цалкам. Гэта мячэці ў вёсцы Лоўчыцы, Іўі і Наваградку. Старажытная мячэць з вёскі Доўбучкі Смаргонскага раёна зараз перавезена ў Беларускі музей народнай архітэктуры і побыту пад Менскам.

Аднак яшчэ напярэдадні другой сусветнай вайны на Гарадзеншчыне існавала 89 драўляных татарскіх мячэцяў. Гэта мячэці ў в. Крышыняны (Гарадзенскі павет), Лоўчыцах (Наваградскі павет). Міры , Мураўшчызне (пад Іўем), Некрашунцах (Лідскі павет), Асмолаве (Наваградскі павет), а таксама ў вялікіх гарадах – Слоніме, Наваградку і Іўі.

З іх у пасляваенныя савецкія часы дзейнічала на ўсю Беларусь толькі мячэць у Іўі, збудаваная ў XIX ст. Гэта амаль квадратны ў плане будынак з высокім, стромкім мінатэрам з балкончыкамі. Дах бажніцы быў доўгі час накрыты гонтай, якую ў 70-х гадах нашага стагоддзя змянілі на бляху, што значна паўплывала на абрысы будынка.

Зусім нядаўна вернікам быў вернуты і капітальна адрамантаваная мячэць у Наваградку. У плане гэта амаль квадратны аб'ём, што пераходзіць у шатровы дах з пакатай чатырохспадавай страхой, завершанай мінарэтам.

Мячэць у Лоўчыцах больш старажытная і мае відавочны ўплыў драўляных праваслаўных (альбо ўніяцкіх) цэркваў XУI – XУII стст. Ён падоўжаны ў плане, мае двухспадавую страху, у сярэдзіне якой мясціўся мінарэт. Зараз татары Беларусі збіраюць сродкі на яго рэстаўрацыю.

Нядаўна адчыніла свае дзверы новая мячэць у Слоніме.

Пасля 1917 года практычна ўсе мячэці і сінагогі ў БССР былі зачыненыя. Шмат будынкаў, асабліва драўляных, было знішчана, мураваныя ж перарабляліся пад гаспадарчыя альбо культурныя патрэбы.

У часы апошняй вайны моцна пацярпелі і сінагогі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якія дзейнічалі па прызначэнню толькі да 1939 года.

У паваенным часе некаторыя будынкі сінагог былі пастаўлены пад дзяржаўную ахову як помнікі архітэктуры, і іх пачалі вывучаць гісторыкі і архітэктары.

Пасля таго, як паўстала незалежная беларуская дзяржава, адразу ж перад грамадствам узнікла некалькі вельмі значных пытанняў.

Па-першае, гэта вяртанне будынкаў іх сапраўдным гаспадарам; па-другое, рэстаўрацыя і вывучэнне архітэктурнай спадчыны беларускіх сінагог і мячэцяў у кантэксце еўрапейскай і сусветнай культуры.

Прыкладам, нядаўна габрэйскай грамадзе вернутая гарадзенская сінагога і распачалася рэстаўрацыя слонімскай, адноўлены будынак Наваградскай мячэці XIX ст. У 90-х гадах было таксама праведзена некалькі навуковых канферэнцый, прысвечаных габрэйскай і татарскай культурам на Беларусі, на якіх разглядалася архітэктура беларускіх сінагог і мячэцяў.

*Алег Трусаў.*

**Рэдактар Станіслаў Суднік**

***Заснавальнік:***
ТБМ імя Францішка Скарыны.
***Пасведчанне аб рэгістрацыі:***
№ 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
***Адрас рэдакцыі:***
220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
***Адрас для паштовых адпраўленняў:***
231300, г. Ліда-2, п/с 7.
***E-mail:*** ns@lida1.lingvo.grodno.by



***Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі***

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 3. 04. 2000 г.
Наклад 3100 асобнікаў. Замова № 986
***Падпісны індэкс:*** 63865.
***Кошт падпіскі:*** 1 мес.- 134 руб., 3 мес.- 402 руб.
***Кошт у розніцу:*** 30 руб.